вершы, як “Мусіць, трэба было”, “Успомні!”, “Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея…”. Яны не выяўляюць страснага пачуцця да адрасата, гэта хутчэй споведзь сябру аб жыццёвых няўдачах, любоўных у тым ліку (“Мусіць, трэба было”), нараканне на адзіноту (“Успомні!”), пошук роднай душы: “Дух такі вольны вольнага духа // Пойме” [1, с. 266] (“Гэй ты, дзяўчына, кветка-лілея…”).

Як бачна, трагічнасць светабачання Я. Купалы прысутнічае і ў яго любоўнай лірыцы. Неадпаведнасць паміж марамі пра каханне і рэалізацыяй гэтага пачуцця ў жыцці паэта выявілася ў вершах, прысвечаных П. Мядзёлцы. Што да вершаў, адрасатам якіх з’яўляецца Уладка Станкевіч, то іх адрознівае меншы напал пачуцця і драматызму. Адрасат іх хутчэй сябар лірычнаму герою, чым каханая.

**Літаратура**


1 Купала, Я. Вершы. Пераклады 1911–1971. Т. 3. / Я. Купала. – Мінск : “Навука і тэхніка”, 1973. – 432 с.



**МГУ им. А. А. Кулешова**

***Т. А. Макарчанка***
*Навук. кір.* ***Д. А. Доўгаль,***
*ст. выкладчык*


## ВОБЛАКА ТЭГАЎ ЯК ПРЫЁМ ВІЗУАЛІЗАЦЫІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

А. А. Вярбіцкі разумее візуалізацыю як “згортванне разумовых працэсаў у наглядны вобраз: будучы ўспрынятым, вобраз можа быць разгорнуты і служыць апорай адэкватных разумовых і практычных дзеянняў” [1, с. 96].

Існуе вялікая разнастайнасць традыцыйных спосабаў візуалізацыі ўрока літаратурнага чытання: апорныя канспекты, схемы, табліцы, планы, разгорнутыя пытанні і адказы, прэзентацыі, відэаролікі, фрагменты кінафільмаў і інш. Аднак з развіццём камп’ютарных тэхналогій з’явіліся і новыя сродкі візуалізацыі: інфаграфіка, інтэлект-карты (логіка-сэнсавыя мадэлі), воблака слоў, стужка часу, калаж і інш. Воблака слоў, або тэгаў, – гэта візуальнае прадстаўленне спісу катэгорый або тэгаў, таксама званых ярлыкамі, ключавымі словамі і да т.п. Воблака слоў арганізавана па прынцыпе гіперспасылак, дзе слова мае тым большы памер у воблаку, чым часцей яно сустракаецца на сайце / у тэксце.

У ходзе педагагічнай практыкі ў 4 “А” класе ДУА “СШ №43 г. Магілёва” былі праведзены ўрокі літаратурнага чытання з выкарыстаннем аблокаў тэгаў. Напрыклад, распрацаванае намі воблака тэгаў па вершы Анатоля Астрэйкі “Плошча Перамогі” (гл. малюнак 1) з’яўляецца дыдактычным сродкам для акцэнтавання ўвагі на ключавых словах твора.

Практыка паказвае, што выкарыстанне воблака тэгаў на ўроку чытання дазваляе зрабіць працэс навучання больш зразумелым і ясным, а таксама, што немалаважна, цікавым і запамінальным. Яркія зрокавыя вобразы спрыяюць трываламу засваенню вучэбнага матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ




Малюнак 1 – Воблака тэгаў па вершы А. Астржйкі “Плошча Перамогі”

**Літаратура**

1 Вербицкий, А.А. Активное обучение в высшей школе : контекстный подход / А.А. Вербицкий. – М. : Высш. шк., 1992. – 207 с.

## СЕКЦИЯ ПРАВОВЕДЕНИЯ

***Е. И. Брызгалова***
*Науч. рук.* ***Ю. И. Иванова,***
*ст. преподаватель*

## ПРАВОСОЗНАНИЕ И СОЦИАЛЬНЫЕ СТЕРЕОТИПЫ

Реализация различного рода норм права не может происходить вне сознания общества. В связи с этим правовое сознание следует рассматривать как важнейший элемент механизма правового регулирования. Одними из составляющих правосознания являются социально-правовые стереотипы. Находясь на границе сознательного и бессознательного, они активно вовлечены в генезис правовых представлений, исключая выбор поведения и способствуя распознаванию новой ситуации как обыденной. Большинство стереотипов ложны и не имеют права на существование. Практически все ситуации индивидуальны, также, как и субъекты, за редким исключением полной аналогии.

Не все стереотипы носят сугубо положительный, либо сугубо отрицательный характер. Многие приносят как пользу, так и вред. Следует также отметить, что из двух противоположных мнений об одном явлении, при наличии большинства положительных фактов такового, человек скорее всего поверит отрицательным исключениям, что приведет к восприятию его сознанием негативного шаблона понимания действительности. Однако нельзя не отметить то, что отрицательные стереотипы зачастую имеют под собой твердую почву. Кроме того, социальные стереотипы являются одним из средств деформации правосознания.

Для опровержения негативных стереотипов и совершенствования правовой действительности недостаточно правового регламентирования разнообразных сфер жизни. Необхо-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ